Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ СУЧАСНАЙ НАВУКІ

Зборнік навуковых прац

Мінск 2016

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

29 672 копы озимого хлеба, 24 811 ярового и 173 378 пудов сена. За 1888 г. русские поселенцы получили 165 руб. пособия [14, л. 26 об.].

Таким образом, к концу 1880-х гг. в Беларуси проживали тысячи землевладельцев русского происхождения, в собственности которых находились миллионы десятин земли. Это было результатом политики царского правительства, направленной на увеличение русского населения в западных губерниях. Переселенцы из российских губерний на льготных условиях приобретали наделы у помещиков, обвиненных в помощи восстанию 1863 г. Точные данные о количестве русских землевладельцев и площади полученных ими наделов в белорусских губерниях назвать затруднительно. Эта проблема требует дальнейшего исследования в отечественной историографии.

## Литература


1. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917) / Т. Е. Леонтьева [и др.] ; сост. Т. Е. Леонтьева, Д. Л. Яцкевич ; редкол.: А. К. Голубович (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелНИИДАД, 2009. – 524 с.
2. Историческое обозрение пятидесятилетней деятельности Министерства государственных имуществ. 1837–1887 : в 5 ч. – СПб. : Тип. Я. И. Либермана, 1888. – Ч. 2. Попечительство. Поземельное устройство. – 547 с.
3. Краткий обзор деятельности управления государственными имуществами Виленской и Ковенской губерний с 1837 по 1903 г. – Вильна : Тип. «Русский почин», 1903. – IV, 64 с.
4. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793–1917) / сост. Т. Е. Леонтьева. – Минск : БелНИИДАД, 2006. – 392 с.
5. Подорожняя, Е. А. Эволюция органов управления государственными имуществами в Беларуси (конец XVIII – начало XX в.) / Е. А. Подорожняя // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2014. – № 2. – С. 33–37.
6. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 13. – Отд. 1. – СПб., 1839. – № 11189. – С. 405–654.
7. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 39. – Отд. 1. – СПб., 1867. – № 40806. – С. 357.
8. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 41. – Отд. 2. – СПб., 1868. – № 44024. – С. 469–471.
9. РГИА. – Фонд 381. Оп. 46. Д. 46. Всеподданнейшие доклады по Второму Департаменту Министерства государственных имуществ.
10. РГИА. – Фонд 381. Оп. 46. Д. 69. Всеподданнейшие доклады по Второму Департаменту Министерства государственных имуществ. – 206 л.
11. РГИА. – Фонд 384. Оп. 12. Д. 9. О продаже некоторых частей государственных имуществ по Гродненской губернии. – 250 л.
12. РГИА. – Фонд 1284. Оп. 69. 1875 г. – Д. 163. Со всеподданнейшим отчетом Витебского губернатора о состоянии губернии за 1874 г. – 72 л.
13. РГИА. – Фонд 1284. Оп. 223. 1885 г. Д. 40. Со всеподданнейшим отчетом Витебского губернатора за 1884 г. – 154 л.
14. РГИА. – Фонд 1284. Оп. 223. 1889 г.Д. 143. С копией со всеподданнейшего отчета о состоянии Виленской губернии за 1888 г. – 67 л.
15. РГИА. – Фонд 1284. Оп. 223. 1889 г. Д. 152. С копией со всеподданнейшего отчета о состоянии Минской губернии за 1888 г. – 72 л.




930 [94:67]"18"

# КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ У КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

# SOURCES ON THE HISTORY OF INDUSTRY OF BELARUS IN THE END OF XVIII – THE FIRST HALF OF THE XIXth CENTURY

П. А. Мацюш

P. Matsiush

*У артыкуле аналізуецца стан крыніцазнаўчай базы па гісторыі прамысловасці Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст., раскрываюцца інфармацыйныя магчымасці апублікаваных і архіўных крыніц*

*The state of source base on the history of industry of Belarus in the end of XVIII – the first half of the XIX century is analyzed in the article, information possibilities of the published and archival sources are revealed*

Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі самадзяржаўе паставіла перад мясцовай адміністрацыяй, гаспадарчымі, ваеннымі і навуковымі ўстановамі практычную задачу па вывучэнні краю. Гэтым тлумачыцца тое, што ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. выходзіць значная колькасць разнастаўных статыстычных зборнікаў.

Аб прамысловым патэнцыяле Беларусі пэўныя звесткі можна запазычыць з «Ваенна-статыстычнага агляду Расійскай імперыі» [4], «Памятных кніг абласцей і губерняў» [7]. У цэлым памятныя кнігі беларускіх губерняў даюць карысную інфармацыю аб іх прамысловым патэнцыяле, але з-за таго, што выданні носяць пераважна апісальны характар, статыстычныя даныя прыведзены ў іх у скарочаным выглядзе.

Галоўнымі айчыннымі і замежнымі архіўнымі ўстановамі, якія складаюць крыніцазнаўчую базу па гісторыі прамысловасці Беларусі канца XVIII – першай палове XIX ст., з'яўляюцца Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Петярбурзе (РДГА), Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ), Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна (НГАБ у Гродна), Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы (ДГАЛ), Archiwum Glovne Akt Davnych w Warshawie (AGAD).

Многія архіўныя матэрыялы РДГА дубліруюць даныя НГАБ у Мінску і Гродна, аднак асобныя фонды істотна дапаўняюць крыніцазнаўчую базу па гісторыі фабрычна-завадской прамысловасці ў XIX ст.

Так, Указам Сената ад 7 ліпеня 1811 г. у складзе Міністэрства ўнутраных спраў быў створаны дэпартамент мануфактур і ўнутранага гандлю (фонд 18). У 1819 г. ён быў перададзены ў Міністэрства фінансаў. Гэты дэпартамент складаўся з чатырох аддзелаў: мануфактурнага, унутранага гандлю, аддзялення акцызу з тытуню і цукровабурачнай вытворчасці і падліковага аддзялення. У названым фондзе ўтрымліваюцца ведамасці аб колькасці выпрацаваных і пададзеных вырабаў [8, с. 16].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У якасці грунтоўнай крыніцазнаўчай базы варта разглядаць Актавыя кнігі Вялікага Княства Літоўскага (1516–1831 гг.), дакументы Галоўнага Літоўскага суда (1797–1831 гг.).

Асаблівае значэнне маюць публікацыі дакументаў і матэрыялаў па гісторыі прамысловасці. Хаця ўрадавыя органы і патрабавалі ад уладальнікаў прадпрыемстваў штогод падаваць звесткі аб характары вытворчасці, аб'ёме прадукцыі, колькасці рабочых, месцы збыту і закупкі сыравіны, аднак складальнікі зборнікаў не змаглі даць поўную і супастаўную карціну прамысловага развіцця краю. Матэрыялы даволі разнастайныя і супярэчлівыя [3].

Звесткі аб прамысловым развіцці Беларусі прыведзены ў справаздачах губернатараў і паліцыі, якія сабраны ў фондах 13, 1263, 1274, 1284, 1297 РДГА. Першыя справаздачы губернатараў былі складзены па асобных губернях за 1804 г. Складаліся яны нерэгулярна, галоўным чынам пры змене губернатараў. Да 1837 г. справаздачы прадстаўляліся ў Міністэрства ўнутраных спраў. З 1827 па 1837 г. паралельна са справаздачамі па губернях складаліся «всеподданнейшие» данясенні губернатараў аб аглядзе губерняў.

Не варта сцвярджаць аб дакладнасці даных, якія ўтрымліваюцца ў справаздачах губернатараў. Ва ўмовах бюракратычнай самаўладнай Расіі губернатары, якія з'яўляліся бескантрольнымі кіраўнікамі значных тэрыторый, не былі зацікаўлены ў раскрыцці сапраўднага становішча губерні. Асабліва на ўскраінах імперыі яны скажалі звесткі, прыхарошвачы рэчаіснасць.

У фондах Цэнтральнага статыстычнага камітэта міністэрства ўнутраных спраў (фонд 1290) і Уласнай яго імператарскага вялікасці канцылярыі (фонд 1409) сабраны справы, якія даюць звесткі не толькі аб колькасці насельніцтва па губернях, але і аб колькасці прамысловых устаноў.

Звесткі аб развіцці прамысловасці ў першай палове XIX ст. пачэрпнуты таксама з фонда канцылярыі віленскага генерал-губернатара (ДГАЛ, фонд 378) і НГАБ у Мінску і Гродна. Асаблівае месца сярод крыніц займаюць матэрыялы фондаў канцылярыі мінскага (фонд 295), віцебскага (фонд 1430), магілёўскага (фонд 2001) і гродзенскага (фонд 1) грамадзянскіх губернатараў.

Звесткі з вышэйназваных архіваў больш дакладныя, чым матэрыялы РДГА, паколькі тут захаваліся не толькі копіі, але і пярвічныя даныя, на падставе якіх складаліся справаздачы. Супастаўленне даных паказвае, што адны звесткі аб справаздачах, збор якіх не быў звязаны з фіскальнымі мэтамі і сведчыў аб дзейнасці губернатара (у тым ліку і прамысловасць) завышаліся, а звязаныя са зборам падаткаў і падацей (колькасць насельніцтва, абавязанага плаціць падаткі, купецкія капіталы і г. д.) – заніжаліся. Наяўнасць першасных матэрыялаў дазваляе ўдакладніць статыстычныя даныя.

Некаторыя звесткі аб прамысловых прадпрыемствах змешчаны ў фондзе 333 (Мінская казённая палата), а таксама з фондаў павятовых казначэйстваў (фонды 335, 336, 2161, 2794 і г.д.) [8, с. 18].



Значны фактычны матэрыял аб развіцці прамысловасці змешчаны ў фондах Цэнтральнага архіва старажытных актаў у Варшаве (AGAD), які быў створаны ў 1808 г. як цэнтральны польскі архіў.

У архіве сабраны матэрыялы з эпохі Сярэднявечча і да канца Першай сусветнай вайны, у тым ліку і па гісторыі Беларусі. Велізарны фактычны матэрыял магчыма знайсці ў архівах Тызенгаўзаў [2] і Радзівілаў [1]. Фамільныя фонды гэтых магнатаў дазваляюць даць дастаткова дакладную характарыстыку магнацкай гаспадаркі Беларусі першай паловы XIX ст. і паказаць уплыў магнацкай гаспадаркі на эканоміку рэгіёна, яе ролю і значэнне ў працэсе генезісу капіталістычных адносін.

Падрабязны археаграфічны і крыніцазнаўчы аналіз выданняў дакументаў па гісторыі Беларусі перыяду позняга феадалізму ўтрымліваюцца ў работах А. П. Ігнаценкі [5], З. Ю. Капыскага [6], Н. Н. Улашчыка [9].

Такім чынам, на сённяшні дзень існуе значны масіў апублікаваных і архіўных крыніц па гісторыі прамысловасці Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Асноўныя крыніцы ўтрымліваюцца ў архіўных установах Беларусі, Расіі, Літвы, Польшчы. Шмат з іх ужо ўведзена ў навуковы ўжытак, што стварае перадумовы для далейшай распрацоўкі названай тэмы.

## *Літаратура і крыніцы*


1. Archiwum Glovne Akt Dawnych w Warszawie. Archiwum Radzivilovskie. Dzial XIX, pudlo 1–84; Dzial XX, XXI. Сведения о хозяйственной деятельности.
2. Archiwum Glovne Akt Dawnych w Warszawie. Archiwum Tysenhauzow. – Dzial D, B Экономические материалы.
3. Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов : в 3 т. – Минск : Изд-во Акад. Наук БССР, 1959–1961. – Т. 3: Воссоединение Белоруси с Россией и ее экономическое развитие в конце XVIII – первой половине XIX в. (1772–1860) / сост.: В. В. Чепко, В. В. Шатило. – 1961. – 625 с.
4. Военно-статистическое обозрение Российской империи. – СПб., 1852. Т. 8. Ч. 1; СПб., 1848. Т. 8. Ч. 3; СПб., 1849. Т. 9. Ч. 34; СПб., 1848. Т. 9. Ч. 4.
5. Игнатенко, А. П. Введение в историю БССР: периодизация, источники, историография / А. П. Игнатенко. – Минск : Высш. шк., 1965.
6. Копысский, З. Ю. Сборники документов по истории Белоруссии, изданные в БССР (1921–1971 гг.) / З. Ю. Копысский // Археографический ежегодник за 1974 год; редкол.: С. О. Шмидт (отв. ред.) [и др.]. – М. : Наука, 1975. – С. 13–23.
7. Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 г. – Гродно, 1860; Памятная книжка Минской губернии на 1861 год. – Минск, 1862.
8. Пракапович, Л. Э. Становление и развитие фабрично-заводской промышленности в Беларуси в XIX в. : монография / Л. Э. Пракапович. – Минск : БГПУ, 2010. – 156 с.
9. Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. – М. : Наука, 1973. – 303 с.




РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ